# КАЛЯНДАР ЮБІЛЕЙНЫХ І ПАМЯТНЫХ ДАТ МІНСКАЙ ВОБЛАСЦІ НА 2023 ГОД

**Жодзіна**, горад (1643) — **380 гадоў з часу заснавання**

**Лагойск**, горад (1078) **— 945 гадоў з часу першых летапісных звестак**

**Нясвіж**, горад — **800 гадоў з часу першага ўпамінання**

**Салігорск**, горад (1958) — **95 гадоў з часу заснавання**

**Смалявічы**, горад — **575 гадоў з часу першага ўпамінання**

**Ждановіч Ібрагім Якубавіч** (1888, г. Клецк — 1943), удзельнік Першай сусветнай вайны, поўны Георгіеўскі кавалер — **135 г.**

**Козел Вікенцій (Вінцэнты) Іванавіч** (1838, в. Сэрвач, Вілейскі раён — 1863), адзін з кіраўнікоў паўстання 1863—1864 гг. — **185 г.**

**Радзівіл Крысціна** (у манастве Яўхімія), дачка Станіслава (1598—1658), абатыста Нясвіжскага бенедыкцінскага манастыра — **425 г.**

**Шыдлоўскі Ігнат Іосіфавіч** (1793, в. Гайна, Лагойскі раён — 1846), беларускі і польскі паэт, перакладчык, выдавец, фалькларыст — **230 г.**

**Шэмеш Адам Казіміравіч** (1808, Слуцкі раён — 1864), жывапісец, мастацтвазнавец — **215 г.**

**Барысаўскі мясакамбінат** (1933), адкрытае акцыянернае таварыства — **90 г.**

**Беларускі аўтамабільны завод (БелАЗ)** (1948, г. Жодзіна), адкрытае акцыянернае таварыства, галоўнае прадпрыемства ў складзе дзяржаўнага вытворчага аб'яднання "Беларускі аўтамабільны завод" — **75 г.**

**Вілейска-Мінская водная сістэма** (Вілейскі, Маладзечанскі, Мінскі раёны, 1968 г.) — **55 гадоў з пачатку будаўніцтва (здадзена ў эксплуатацыю 15.01.1976 г.)**

**Вілейскі Крыжаўзвіжанскі касцёл** (1906—1913, г. Вілейка), помнік архітэктуры раманскага стылю і готыкі, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **110 гадоў з часу пабудовы**

**Засвірскі Траецкі касцёл і кляштар кармялітаў** (1713—1714, в. Засвір, Мядзельскі раён), помнік драўлянага дойлідства, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **300 гадоў з пачатку пабудовы**

**Касцяневіцкі касцёл Божай Маці** (1763, в. Касцяневічы, Вілейскі раён), помнік архітэктуры позняга барока, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **260 гадоў з часу пабудовы**

**Клецкая Васкрасенская царква** (1683), помнік архітэктуры барока, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **340 гадоў з часу пабудовы**

**"Минские губернские ведомости"**, афіцыйная газета Мінскага губернскага праўлення (1838—1917) — **185 г.**

**Навасвержанская Успенская царква** (в. Новы Свержань, Стаўбцоўскі раён), помнік архітэктуры ранняга барока, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **280 гадоў з часу пабудовы каменнага будынка**

**Нясвіжская балетная школа пры тэатры Радзівілаў** (1758—1790**)** — **265 гадоў з пачатку заснавання**

**Пяршайскі Юр'еўскі касцёл** (1933, в. Пяршаі, Валожынскі раён), помнік архітэктуры неараманскага стылю, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **90 г.**

**Ракаўская Спаса-Праабражэнская царква** (1793, в. Ракаў, Валожынскі раён), помнік архітэктуры барока, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь — **230 гадоў з часу пабудовы**

## Студзень

**1 — Баравік Фёдар Васільевіч** (1923, в. Кашалі, Пухавіцкі раён — 1991), вучоны-эканаміст, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі — **100 г.**

**1 — "Маладзечнаводаканал"**, камунальнае ўнітарнае прадпрыемства (1948 г.) — **75 гадоў з часу заснавання**

**1 — Блонская сельская бібліятэка ДУК "Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка"** (аг. Блонь, Пухавіцкі раён) — **70 гадоў з часу адкрыцця**

**1 — Крывальцэвіч Мікалай Мікалаевіч** (1958, в. Канстанцінаўка, Любанскі раён), беларускі археолаг, кандыдат гістарычных навук, старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі — **65 г.**

**1 — Міклашэўскі Уладзімір Уладзіміравіч** (1983, г. Лагойск), беларускі спартсмен, (біятлон), бронзавы прызёр па біятлоне Чэмпіяната Еўропы, бронзавы прызёр Чэмпіянату свету сярод юніёраў, чэмпіён Міжнароднай зімовай Універсіяды — **40 г.**

**2 — Чыркін Аляксандр Аляксандравіч** (1943, г. Слуцк), вучоны ў галіне біяхіі, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986) — **80 г.**

**2 — Анушка Юрый** (1963, в. Лугавая Слабада, Мінскі раён), скульптар, аўтар твораў у манументальнай і станковай скульптуры — **60 г.**

**2 — Валадзько Леанід Вікенцьевіч** (1928, в. Баравое, Дзяржынскі раён — 1978), вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **95 г.**

**2 — Ганчарэнка Андрэй Маркавіч** (1933, в. Версанка, Крупскі раён — 2021), вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1984), лаўрэат прэміі НАН Беларусі (1995) — **90 г.**

**2 — Фінскі Аляксандр Міхайлавіч** (1953, в. Вясёлы Гай, Пухавіцкі раён), скульптар, аўтар твораў у манументальнай і станковай скульптуры, пластыцы малых форм, медальерным мастацтве, педагог, лаўрэат прэміі Беларускага саюза архітэктараў, спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь, Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **70 г.**

**3 — Бардовіч Анатоль Майсеевіч** (1928, в. Малыя Навасёлкі, Дзяржынскі раён), мовазнаўца, педагог, Заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі — **95 г.**

**5 — Вайтовіч Аляксандр Паўлавіч** (1938, в. Рачкевічы, Капыльскі раён), вучоны-фізік, дзяржаўны дзеяч, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, лаўрэат прэміі НАН Беларусі і Сібірскага аддзялення РАН імя акадэміка В. А. Капцюга — **85 г.**

**5 — Ровенскі Дзмітрый Дзмітрыевіч** (1948, г. Капыль), дзеяч самадзейнага мастацтва, майстар народных інструментаў, Заслужаны дзеяч культуры Беларусі — **75 г.**

**5 — Хахол Мікалай Рыгоравіч** (1948, Бярэзінскі раён — 1997), спартсмен (веславанне на байдарках і каноэ), заслужаны майстар спорту СССР — **75 г.**

**6 — Александровіч Анатоль Вячаслававіч** (1953, г. Дзяржынск — 2017), графік, заснавальнік літаратурна-мастацкай газеты для дзяцей "Детский мир" — **70 г.**

**8 — Наркевіч-Ёдка Якуб Антонавіч** (1848, в. Турын, Пухавіцкі раён — 1905), прыродазнаўца, вынаходнік, медык — **175 г.**

**9 — Шаховіч Мечыслаў Зяновіч** (1933, в. Крывічы, Мядзельскі раён — 2008), паэт, песеннік, перакладчык — **90 г.**

**10 — Сцешыц Валянцін Кірылавіч** (1928, Салігорскі раён — 1997), вучоны ў галіне судова-медыцынскай экспертызы — **95 г.**

**11 — Каранеўскі Язэп Пятровіч** (1888, г. Заслаўе — 1937), дзяржаўны дзеяч Беларусі, педагог, правадзейны член Інбелкульта — **135 г.**

**13 — Суцін Хаім** (1893, г. п. Смілавічы, Чэрвеньскі раён — 1943), жывапісец, адзін з вядучых прадстаўнікоў экспрэсіянізму, які жыў і працаваў у Францыі — **130 г.**

**14 — Літавец, вёска (Дзяржынскі раён) — 80 гадоў з часу знішчэння нямецка-фашысцкімі захопнікамі (1943 г.)**

**14 — “Маладзечна”**, станцыя УП “Мінскае аддзяленне Беларускай чыгункі” (1873) — **150 г. з часу заснавання**

**15 — Мінская вобласць** (1938) — **85 гадоў з часу заснавання**

**17 — Фрыд Евель Саламонавіч** (1893, г. п. Рудзенск, Пухавіцкі раён — 1949), ваенны ўрач-тэрапеўт, генерал-маёр, удзельнік Грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў — **130 г.**

**18 — Юркевіч Мікалай Рыгоравіч** (1928, в. Сяргеевічы, Пухавіцкі раён — 2017), правазнавец, сацыёлаг, заслужаны юрыст Беларусі — **95 г.**

**19 — Мятліцкі Аляксандр Іванавіч** (1953, в. Прудзішча, Смалявіцкі раён — 2003), скульптар, лаўрэат прэміі ЦК ВЛКСМ — **70 г.**

**20 — Рак Рыгор Пракопавіч** (1893, аг. Дукора, Пухавіцкі раён — 1938), краязнаўца, які вывучаў народныя рамёствы і саматужныя промыслы, эканамічны стан раёнаў БССР — **130 г.**

**22 — Жыбуль Вячаслаў Васільевіч** (1948, в. Заямнае, Стаўбцоўскі раён), крытык, літаратуразнаўца — **75 г.**

**22 — Слабадакучынская сельская бібліятэка-клуб ДУК “Капыльская раённая цэнтральная бібліятэка імя А. Астрэйкі”** (1973, в. Слабада-Кучынка, Капыльскі раён) — **50 г. з часу заснавання**

**22 — Варона Ларыса Іванаўна** (1983, г. Крупкі), беларуская лыжніца і біятланістка, майстар спорту — **40 г.**

**23 — “Сярэдняя школа № 3 г. Крупкі”**, дзяржаўная ўстанова адукацыі (1993) — **30 г. з часу заснавання**

**25 — Гуткоўскі Павел Макаравіч** (1893, в. Забелы, Слуцкі раён — 1962), графік, аўтар першага афармлення паэмы “Новая зямля” Я. Коласа (1923) — **130 г.**

**29 — Ярмошына Лідзія Міхайлаўна** (1953, г. Слуцк), дзяржаўны дзеяч Беларусі, Заслужаны юрыст Беларусі, старшыня Цэнтральнай камісіі Рэспублікі Беларусь па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў (з 1996 г.), кавалер ордэна Пашаны — **70 г.**

**29 — Скірмунт-Твардоўская Марыя** (1858, Мядзельскі раён — 1907), батанік, даследчыца флоры Беларусі, складальнік гербарных збораў рэдкіх відаў раслін беларусскага Палесся — **165 г.**

**30 — Гараўскі Апалінар Гілярыявіч** (1833, в. Уборкі, Бярэзінскі раён — 1900), жывапісец, педагог, майстар пейзажа і партрэта — **190 г.**

**30 — Чуйка Мікалай Макаравіч** (1903, в. Серагі, Слуцкі раён — 1983), вучоны, вынаходнік, доктар тэхнічных навук, прафесар — **120 г.**

**30 — Глухое Перхурава, вёска (Дзяржынскі раён) — 80 гадоў з часу знішчэння нямецка-фашысцкімі захопнікамі (1943 г.)**

**30 — Шаўчук Ігар Сяргеевіч** (1953, г. Слуцк — 2011), авіяцыйны канструктар, Генеральны канструктар ААТ “Туполеў”, заслужаны канструктар Расійскай Федэрацыі, ганаровы авіябудаўнік — **70 г.**

**Люты**

**1 — Алешка Антон Антонавіч** (1913, в. Балотчыцы, Слуцкі раён — 1971), пісьменнік, ваенны ўрач — **110 г.**

**2 — Самусенка (дзяв. Пятрэнка) Таццяна Дзмітрыеўна** (1938, аг. Астрашыцкі Гарадок, Мінскі раён — 2000), спарстменка (фехтаванне на рапірах), заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі, чэмпіёнка XVII (1960, Рым), XIX (1968, Мехіка), XX (1972, Мюнхен) Алімпійскіх гульняў — **85 г.**

**3 — Любанскі раённы цэнтр культуры**, установа культуры — **30 год з дня заснавання (1993)**

**3 — Улашчык Уладзімір Сяргеевіч** (1943, в. Валіцкаўшчына, Мінскі раён — 2018), вучоны ў галіне фізіятэрапіі і курорталогіі, акадэмік НАН Беларусі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1986) — **80 г.**

**6 — Яромка Вячаслаў Мікалаевіч** (1938, в. Дубянцы, Мінскі раён), вучоны ў галіне будаўніцтва аўтадарог, заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **85 г.**

**6 — Віктар Іванавіч Шэмпель (**1908, г. Мінск - 1975**)**, беларускі вучоны ў галіне аграхіміі — **115 г.**

**8 — Ахрэм Апанас Андрэевіч** (1903, в. Урэчча, Вілейскі раён — 2010), вучоны ў галіне біяарганічнай хіміі, акадэмік НАН Беларусі, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі — **110 г.**

**8 — Інсараў Іван Анісімавіч** (1903, в. Селішча, Слуцкі раён — 1983), урач, дзяржаўны дзеяч Беларусі, заслужаны ўрач Беларусі — **120 г.**

**8 — Ляпёшкін Уладзімір Ігнацьевіч** (1928, в. Церабель, Пухавіцкі раён — 1994), паэт, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, заслужаны настаўнік БССР — **95 г.**

**9 — Касцючэнка Аляксандр Аляксандравіч** (1958, в. Вішнева, Валожынскі раён — 2019), мастак-сцэнограф, лаўрэат спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва (2015) — **65 г.**

**10 — Высоцкі Міхаіл Сцяпанавіч** (1928, в. Семежава, Капыльскі раён — 2013), вучоны ў галіне машынабудавання, акадэмік НАН Беларусі, Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі Беларусі, Заслужаны работнік прамысловасці СССР, Герой Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай

прэміі СССР і Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Леніна, ордэнаў Айчыны III і II ступеняў і інш. — **95 г.**

**10 — Шайко Іван Паўлавіч** (1948, в. Шайкі, Клецкі раён), вучоны ў галіне жывёлагадоўлі, аўтар прац па гадоўлі, селекцыі, генетыцы і ўзнаўленню сельскагаспадарчых жывёл, акадэмік НАН Беларусі, замежны член Расійскай акадэміі сельскагаспадарчых навук, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **75 г.**

**10 — Каганец Карусь (сапр. Казімір-Рафаіл Карловіч Кастравіцкі)** (1868, г. Табольск (в. Засулле, Стаўбцоўскі раён) — 1918), беларускі паэт, драматург, перакладчык, грамадскі дзеяч, мовазнаўца — **155 г.**

**10 — Жук-Грышкевіч Вінцэнт** (1903, в. Будслаў, Мядзельскі раён — 1989), педагог, літаратуразнаўца, гісторык — **120 г.**

**10 — Умрэйка Аляксандр Яраслававіч** (1958, в. Пясочнае, Капыльскі раён), гісторык, пісьменнік — **65 г.**

**12 — Бурак Аляксандр Кандратавіч** (1918, г. Дзяржынск — 1993), лётчык, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза (1945) — **105 г.**

**13 — Глінскі Іаахім** (1853, в. Будслаў, Мядзельскі раён — 1898), спявак, арганіст, кампазітар, аўтар музыкі на словы А. Міцкевіча і У. Сыракомлі — **170 г.**

**15 — Мар'інагорская гарадская бібліятэка ДУК "Пухавіцкая цэнтральная раённая бібліятэка"** (1993) — **30 гадоў з часу заснавання**

**16 — "Любанскі"**, саўгас (э/база "Любанская") (1948) —**75 г. з часу заснавання**

**19 — Шушкевіч Станіслаў Пятровіч** (1908, в. Бакінава, Дзяржынскі раён — 1991), паэт, заслужаны работнік культуры Беларусі — **115 г.**

**20 — Шушкевіч Міхась Серафімавіч** (1933, в. Ветка, Слуцкі раён), паэт-песеннік, збіральнік беларускага фальклору — **90 г.**

**20 — Пуховіч Франц Ян** (1933, в. Канстанцінава, Мядзельскі раён), акцёр, рэжысёр — **90 г.**

**20 — Раманчук Іван Мікалаевіч** (1943, Любанскі раён), беларускі педагог, кампазітар, музыкант, паэт. Мастацкі кіраўнік народнага ансамбля музыкі, песні і танца "Мінскі гармонік" — **80 г.**

**22 — Ачапоўскі Станіслаў Уладзіміравіч** (1878, в. Ёдчыцы, Клецкі раён — 1945), вучоны-ўрач, хірург, акуліст, Заслужаны дзеяч навукі — **145 г.**

**24 — Скурко Іосіф Уладзіміравіч** (1938, в. Пількаўшчына, Мядзельскі раён — 1989), паэт, многія вершы якога пакладзены на музыку, кінадраматург, перакладчык — **85 г.**

**25 — Буткевіч Валянціна Уладзіміраўна** (1948, в. Леткаўшчына, Слуцкі раён), беларускі педагог і вучоны ў галіне педагогікі і псіхалогіі — **75 г.**

**26** — **Замбржыцкі Станіслаў Валянцінавіч** (1823, в. Вязынка, Заслаўская воласць, Мінскі павет (цяпер Маладзечанскі раён) — 1907), паэт, краязнаўца, які першы апісаў Вязынкаўскае гарадзішча — **200 г.**

**26** — **Вінаградаў Дзмітрый Леанідавіч** (1943, Казахстан), беларускі пісьменнік, член Саюза пісьменнікаў Беларусі, член літаратурнага аб'яднання "Нёманец". З 1990 года жыве ў г. Узда Мінскай вобласці — **80 г.**

**26** — **Варламаў Сяргей Мікітавіч** (1968, г. Крупкі), мастак — **55 г.**

**27** — **Сучко Аляксандр Антонавіч** (1938, г. Маладзечна), спартсмен і трэнер (гарадошны спорт), майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі, чэмпіён СССР (1982) у камандным заліку, чэмпіён Беларусі (1978, 1989) — **85 г.**

**28** — **Германовіч Іван Клімавіч** (1928, Капыльскі раён — 2001), мовазнавец, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1998) — **95 г.**

## Сакавік

**1** — **Шкель Міхаіл Пятровіч** (1918, в. Бялевічы, Слуцкі раён — 2003), вучоны ў галіне земляробства, доктар сельскагаспадарчых навук — **105 г.**

**1** — **"Смілавіцкая валюшна-лямцавая фабрыка"**, адкрытае акцыянернае таварыства (1928, Чэрвеньскі раён) — **95 гадоў з часу заснавання**

**2** — **Бачыла Алесь (Аляксандр Мікалаевіч)** (1918, в. Лешніца, Пухавіцкі раён — 1983), паэт, драматург, перакладчык, Заслужаны дзеяч культуры Беларусі, кавалер ордэнаў "Знак Пашаны", Дружбы народаў і інш. — **105 г.**

**3** — **60 год** (1963) з моманту адкрыцця санаторыя **"Нарач"** (Мядзельскі раён).

**6** — **Мезенка Ганна Міхайлаўна** (1948, в. Альбянка, Нясвіжскі раён), лінгвіст, педагог, выдатнік адукацыі Беларусі, лаўрэат прэміі НАН Беларусі (1999) — **75 г.**

**7** — **Чарняўскі Міхаіл Міхайлавіч** (1938, в. Круці, Мядзельскі раён — 2013), вучоны-археолаг, даследчык матэрыяльнай і духоўнай культуры плямён каменнага і бронзавага вякоў паўночна-заходняй Беларусі, пісьменнік — 85 г.

**7** — **60 год** (1963) пасёлак **Жодзіна** атрымаў статус абласнога падпарадкавання.

**7** — **55 год** (1968) з дня атрымання г. п. **Любань** статуса горада.

**8** — **Сеўрук Ніна Аляксандраўна** (1933, Слуцкі раён — 2009), журналіст, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі імя І. Мележа (1984) — **90 г.**

**10** — **Зайцаў Мікалай Якаўлевіч** (1923, г. Крупкі — 2012), ваенны дзеяч, удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза,

ганаровы грамадзянін г. Крупкі і Крупскага раёна, вучоны-філосаф — **100 г.**

**10 — Кірдзей Рыгор Іванавіч** (1938, г. п. Чырвоная Слабада, Салігорскі раён), мастак, які працуе ў галіне станковага і манументальна-дэкаратыўнага жывапісу — **85 г.**

**10 — Сідаровіч Яўген Антонавіч** (1928, г. Беразіно — 2017), вучоны ў галіне экалагічнай фізіялогіі раслін, батанікі, аховы навакольнага асяроддзя, член-карэспандэнт НАН Беларусі, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна "Знак Пашаны" — **95 г.**

**11 — Вяль Генадзь Ігаравіч** (1958, в. Бярозаўцы, Маладзечанскі раён), графік, мастак экслібрыса, лаўрэат прэмій прэстыжных еўрапейскіх конкурсаў (Бельгія, Югаславія, Галандыя, Германія і інш.), педагог — **65 г.**

**11 — Гілеп Уладзімір Аляксандравіч** (1938, в. Вострава, Капыльскі раён), гісторык, краязнаўца, дзяржаўны дзеяч Беларусі, старшыня грамадскага аб'яднання "Беларускі фонд культуры" (з 1996 г.), адзін з ініцыятараў і непасрэдных удзельнікаў стварэння Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту, Веткаўскага музея народнай творчасці, Заслаўскага і Раўбіцкага музеяў, гісторыка-культурных запаведнікаў у Полацку, Заслаўі, Нясвіжы, персанальных музеяў А. Міцкевіча, В. Ваньковіча, М. Шагала, М. Багдановіча і інш., лаўрэат прэміі Беларускага прафсаюза работнікаў культуры — **85 г.**

**14 — Хацкевіч Аляксандр Фёдаравіч** (1923, в. Тартак, Барысаўскі раён — 1995), вучоны-гісторык, заслужаны работнік вышэйшай школы Беларусі — **100 г.**

**14 — 75 год** з дня заснавання **Галавацкай сельскай бібліятэкі** (Клецкі раён)

**15 — Бяляеў Якаў Дзмітрыевіч** (1918, в. Сомры, Крупскі раён — 1941), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **105 г.**

**15 — Зубкоўскі Браніслаў Аляксандравіч** (1938, г. Мар'іна Горка — 2015), літаратар, пісьменнік, краязнаўца — **85 г.**

**15 — Лапошыч Ала Васільеўна** (1938, г. Барысаў), паэт — **85 г.**

**17 — Харык Ізі (Ісак Давыдавіч)** (1898 (па іншых крыніцах 06.03.1896), в. Зембін, Барысаўскі раён — 1937), яўрэйскі паэт, член-карэспандэнт НАН Беларусі — **125 г.**

**18 — Павел Пранузa** (1918, в. Вылева, Магілёўскай губ. - 2007), беларускі паэт, з 1947 года член Саюза пісьменніка Беларусі — **105 г.**

**18 — Гучок Пётр Іосіфавіч** (1923, в. Лысоўшчына, Пухавіцкі раён — 1945), лётчык, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**18 — Нікалаева-Апіёк Тамара Іванаўна** (1943, аг. Ляды, Чэрвеньскі раён), актрыса, Заслужаная артыстка Беларусі — **80 г.**

**20 — Вайцяховіч Сяргей Грыгор'евіч** (1903, в. Сярагі, Слуцкі раён — 1977), адзін з кіраўнікоў камуністычнага падполля і партызанскага руху ў гады Вялікай Айчыннай вайны — **120 г.**

**21 — Якубовіч Леанід Яўгеньевіч** (1948, Салігорскі раён — 1970), паэт — **75 г.**

**21 — Клюбко Адам Адамавіч** (1923, в. Кармазы, Старадарожскі раён — 2008), Герой Сацыялістычнай Працы (1966) — **100 г.**

**21 — Жыбрык Ніна Іосіфаўна** (1933, в. Малыя Навасёлкі, Дзяржынскі раён — 2012), пісьменніца — **90 г.**

**21 — Старадарожскі раённы падпольны камітэт КП(б)Б** (1943) — **80 г. з часу заснавання**

**22 — Лемеш Уладзімір Піліпавіч** (1908, в. Падлессе, Слуцкі павет, Мінская губерня (цяпер Слуцкі раён) — 1975), вучоны ў галіне заатэхнік, Заслужаны дзеяч навукі Беларусі — **115 г.**

**22 — Хатынь**, былая вёска (Лагойскі раён) — **80 гадоў з часу знішчэння нямецка-фашысцкімі захопнікамі (1943 г.)**

**22 — Ждановіч Таццяна Аляксандраўна** (1918, в. Талька, Пухавіцкі раён — 1998), медык, заслужаны ўрач БССР — **110 г.**

**23 — Варанецкі Фама Сільвестаравіч** (1938, в. Траскоўшчына, Мінскі раён), акцёр, педагог, Заслужаны артыст Беларусі — **85 г.**

**25 — Зайцаў Мікалай Якаўлевіч** (1923, г. Крупкі — 2012), удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

**26 — Зубковіч Уладзімір Гаўрылавіч** (1863, г. Смалявічы — 1938), протаіерэй, новапакутнік Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы — **160 г.**

**28 — Каробкіна Святлана Тарасаўна** (1938, аг. Сеніца, Мінскі раён), паэтэса — **85 г.**

**28 — Марціновіч Мікалай Сцяпанавіч** (1938, в. Корань, Лагойскі раён — 1981), эканаміст, кандыдат эканамічных навук (1966), дацэнт (1976) — **85 г.**

**29 — Цуба Іван Самуілавіч** (1873, в. Навіны (цяпер в. Цубы) Салігорскі раён — 1943), герой Вялікай Айчыннай вайны, які паўтарыў подзвіг І. Сусаніна — **150 г.**

**31 — Шадыра Алег Іосіфавіч** (1948, Вілейскі раён — 2022), вучоны ў галіне радыяцыйнай хіміі і хіміі свабодных радыкалаў, выдатнік адукацыі — **75 г.**

## Красавік

**3 — Барташэвіч Людміла Мікалаеўна** (1938, г. Беразіно), актрыса Беларускага рэспубліканскага тэатра юнага гледача, выканальніца роляў у пастаноўках на Беларускім радыё — **85 г.**

**3** – **Віленчыц Баляслаў Баляслававіч** (1943, в. Залаззе, Стаўбцоўскі раён), вучоны-фізік, вынаходнік СССР, лаўрэат прэміі Савета Міністраў Беларусі (1991) – **80 г.**

**4** – **Лайкоў Уладзімір Філіпавіч** (1953, в. Астраўкі, Крупскі раён – 2022), літаратар, педагог. У 1979–2007 гг. дырэктар ДУА "Мётчынская сярэдняя школа Барысаўскага раёна", ініцыятар стварэння школьнага музея "Літаратурны космас Мётчы" – **70 г.**

**5** – **Дукса Мар'ян Мікалаевіч** (1943, в. Каракулічы, Мядзельскі раён – 2019), паэт, лаўрэат Літаратурнай прэміі імя А. Куляшова, Нацыянальнай літаратурнай прэміі – **80 г.**

**6** – **Сянчук Уладзімір Сцяпанавіч** (1923, аг. Пухавічы, Пухавіцкі раён – 2008), гігіеніст, кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт – **100 г.**

**7** – **Валянціна Мінская (свецкае імя Сулкоўская Валянціна Фёдараўна)** (1888, в. Станькава, Дзяржынскі раён –1966), святая блажэнная Беларускай Праваслаўнай Царквы – **135 г.**

**9** – **Кавалеўская Соф'я** (1853, в. Малыя Бакшты, Маладзечанскі раён – 1918), фальклярыстка, этнограф, пісьменніца – **170 г.**

**13** – **Гілевіч Жанна Вікенцьеўна** (1933, г. Барысаў), краязнаўца – **90 г.**

**14** – **Завітневіч Уладзімір Зянонавіч** (1853, в. Ліцвяны, Уздзенскі раён – 1927), археолаг і гісторык, даследчык археалагічных помнікаў усходніх славян на тэрыторыі Беларусі – **170 г.**

**15** – **Макарэвіч Пётр Рыгоравіч** (1938, в. Шынкі, Крупскі раён – 2014), літаратар, журналіст, літаратуразнаўца – **85 г.**

**17** – **Арамнаў Андрэй Мікалаевіч** (1988, г. Барысаў), Заслужаны майстар спорту Беларусі, алімпійскі чэмпіён, чэмпіён свету – **35 г.**

**17** – **Фартунаў Ігар Анатольевіч** (1973, г. Маладзечна), спартсмен (інваспорт, лёгкая атлетыка), майстар спорту Беларусі міжнароднага класа, чэмпіён XII Паралімпійскіх гульняў, чатырохразовы чэмпіён свету, рэкардсмен свету і Еўропы – **50 г.**

**18** – **Дыбоўскі Уладзіслаў Іванавіч** (1838, былы маёнтак Адамарын (цяпер не існуе), Маладзечанскі раён – 1910), вучоны ў галіне заалогіі, паленталогіі, мінералогіі і батанікі, фальклярыст – **185 г.**

**18** – **Шаркоў Анатоль Васільевіч** (1948, г. п. Халопенічы, Крупскі раён – 2020), вучоны-гісторык, юрыст, даследчык гісторыі органаў унутраных спраў, Вялікай Айчыннай вайны, праблем удасканалення крымінальна-выканаўчага заканадаўства, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь "За духоўнае адраджэнне" – **75 г.**

**19** – **Гарбацэвіч Васіль Савіч** (1893, аг. Дукора, Пухавіцкі раён – 1985), драматург, адзін з пачынальнікаў беларускай драматургіі, педагог, заслужаны настаўнік Беларусі – **130 г.**

**19** – **Пікулік Міхаіл Міхайлавіч** (1948, г. Чэрвень – 2006), вучоны ў галіне заалогіі і экалогіі, член-карэспандэнт НАН Беларусі – **75 г.**

**21** – **Аляхновіч Мікола (Мікалай Мікалаевіч**) (1903, г. Барысаў – 1959), крытык, аўтар артыкулаў і рэцэнзій пра творчасць А. Александровіча, М. Багдановіча, М. Зарэцкага, Я. Коласа, Р. Мурашкі, П. Труса, Я. Скрыгана, А. Пушкіна, М. Горкага – **160 г.**

**22** – **Шаплыка Аляксандра Аляксандраўна** (1893, в. Макавічы, Глускі раён – 1988), брыгадзір калгаса "Чырвоная змена" Любанскага раёна, Герой Сацыялістычнай Працы (1949) – **130 г.**

**23** – **Вялеська Яўген Іванавіч** (1938, в. Вялікая Лысіца, Нясвіжскі раён), вучоны ў галіне кібернетыкі і інфарматыкі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1972) і прэміі Савета Міністраў СССР (1983), кавалер ордэна "Знак Пашаны" – **85 г.**

**23** – **Жодзінскі дзяржаўны політэхнічны каледж,** сярэдняя спецыяльная навучальная ўстанова (1973) – **50 г. з часу стварэння**

**23** – **Марозава Марыяна Генадзьеўна** (1958, г. Дзяржынск), кампазітар, педагог, уладальніца знака Міністэрства культуры Беларусі "За ўклад у развіццё культуры Беларусі" (2010) – **65 г.**

**24** – **Мінская праваслаўная епархія,** адміністрацыйна-тэрытарыяльная адзінка Беларускай Праваслаўнай Царквы (1793) – **230 г. з часу ўтварэння**

**25** – **Навіцкі Міхаіл Фёдаравіч** (1933, г. Лагойск – 1979), жывапісец, які працаваў у станковым жывапісе ў жанрах карціны, пейзажа, партрэта – **90 г.**

**26** – **Арлоўскі Яўстафій Філарэтавіч** (1863 ці 1862, в. Славенск, Валожынскі раён – 1913), гісторык, краязнавец, педагог – **160 г.**

**26** – **Гурыновіч Георгій Паўлавіч** (1933, г. Барысаў – 1994), вучоны-фізік, акадэмік НАН Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі (1980) – **90 г.**

**27** – **Гайдукевіч Аляксандр Мікалаевіч** (1938, г. Мар'іна Горка – 1998), вучоны, доктар медыцынскіх навук (1982) – **85 г.**

**28** – **Аксак (сапр. Арлова) Валянціна Іванаўна** (1953, в. Смалічы, Нясвіжскі раён), паэтэса – **70 г.**

## Май

**1** – **Кроль Адам** (1913, мяст. Койданава, Мінскі павет, Мінская губерня (цяпер г. Дзяржынск) – 1990), жывапісец, які працаваў у станковым жывапісе ў жанрах фігуратызнай карціны і пейзажу – **110 г.**

**3** – **Сіўчыкаў Уладзімір Мікалаевіч** (1958, г. Жодзіна – 2021), пісьменнік, перакладчык, мастак – **65 г.**

**3** – **Пунтус Леанід Мікалаевіч** (1928, в. Гайна, Лагойскі раён – 1978), Герой сацыялістычнай Працы (1971) – **95 г.**

**4 — Сманцар Анатоль Пятровіч** (1933, в. Лабачыха, Барысаўскі раён — 2020), вучоны ў галіне педагогікі, заслужаны дзеяч навукі Беларусі, выдатнік адукацыі Беларусі — **90 г.**

**4 — Мікалай (у свеце Мацкевіч Мікалай Сцяпанавіч)** (1878, г. Барысаў, Барысаўскі павет, Мінская губерня (цяпер Барысаўскі раён) — 1937), іерэй, новапакутнік Мінскай епархіі Беларускай Праваслаўнай Царквы — **145 г.**

**7 — Нясвіжскі палацава-паркавы комплекс** (1583), помнік абарончай архітэктуры, рэзідэнцыя князёў Радзівілаў, унесены ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь і Спіс аб'ектаў Сусветнай культурнай і прыроднай спадчыны ЮНЕСКА — **440 гадоў з часу закладкі замка**

**9 — Івашын Васіль Уладзіміравіч** (1913, в. Ляхавічы, Дзяржынскі раён — 2009), літаратуразнаўца, педагог, акадэмік НАН Беларусі — **110 г.**

**9 — Касько Уладзімір Канстанцінавіч** (1938, г. Фаніпаль, Дзяржынскі раён), фалькларыст, журналіст, Заслужаны журналіст Беларусі, Заслужаны работнік адукацыі Беларусі — **85 г.**

**10 — Вітко Уладзімір Ільіч** (1933, аг. Грэск, Слуцкі раён — 2020), мастак, майстар лірычнага пейзажу, партрэта, тэматычнай карціны, творы якога знаходзяцца ў Нацыянальным мастацкім музеі Рэспублікі Беларусь, Віцебскім абласным краязнаўчым музеі, Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва ў Мінску, у прыватных калекцыях нашай краіны і за мяжой — **90 г.**

**10 — Кананові́ч Іван Іванавіч** (1938, в. Кукавічы, Капыльскі раён), пісьменнік — **85 г.**

**11 — Ачапоўскі Міхаіл Мікалаевіч** (1788, в. Пацейкі, Капыльскі раён — 1854), вучоны-аграбіёлаг, эканаміст, дзеяч асветы — **235 г.**

**11 — Дыбоўскі Бенядзікт Іванавіч** (ці 12 мая 1833, былы маёнтак Адамарын, Маладзечанскі раён — 1930), прыродазнаўца, заолаг, даследчык Усходняй Сібіры і Далёкага Усходу, урач, публіцыст, замежны член-карэспандэнт АН СССР, член Польскай АН — **190 г.**

**15 — Кукраш Мікалай Патапавіч** (1928, в. Закальное, Любанскі раён), вучоны ў галіне сельскай гаспадаркі, доктар сельскагаспадарчых навук (1987) — **95 г.**

**16 — Луцэвіч Анатоль Васільевіч** (1938, в. Тоўсты Лес, Уздзенскі раён — 2002), акцёр тэатра і кіно, заслужаны артыст Беларусі — **85 г.**

**17 — Дзятлаў Яўген Канстанцінавіч** (1923, в. Бабы, Пухавіцкі раён — 2003), заслужаны архітэктар Беларусі — **100 г.**

**18 — Казінец Міхаіл Антонавіч** (1938, в. Цынцавічы, Вілейскі раён — 2021), дырыжор, педагог, мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча, народны артыст Беларусі, заслужаны дзеяч мастацтваў Беларусі — **85 г.**

**20** — **Шпількевіч Міхаіл Аляксандравіч** (1923, Пухавіцкі раён — 1995), вучоны насеннявод-бульбавод, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1974) — **100 г.**

**20** — **Чупрыгіна Людміла Трафімаўна** (1938, Капыльскі раён), вучоны ў галіне сістэмнага праграмнага забеспячэння ЭВМ, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР (1978) — **85 г.**

**21** — **Літвіненка Аляксандр Інакенцьевіч** (1948, г. Мар'іна Горка, Пухавіцкі раён), трэнер (лёгкая атлетыка), педагог, заслужаны трэнер Беларусі, сярод выхаванцаў якога шэраг чэмпіёнаў і прызёраў Параалімпійскіх гульняў — **75 г.**

**21** — **Козел Іван Васільевіч** (1928, в. Канчаны Вілейскі павет, Віленскае ваяводства (цяпер Маладзечанскі раён) — 1970), драматург — **95 г.**

**22** — **Кухарава Дзіна Уладзіміраўна** (1928, г. Старыя Дарогі), дзеяч аматарскага мастацтва, заслужаны работнік культуры Беларусі — **95 г.**

**22** — **Бутвілоўскі Рычард Пятровіч** (1933, г. Барысаў — 1977), кампазітар, аўтар твораў для аркестра народных інструментаў, сімфанічнага і эстраднага аркестраў, музыкі для тэатра і кіно, педагог — **90 г.**

**22** — **Клімковіч Раіса Паўлаўна** (1953, в. Ляхаўка, Барысаўскі раён), мастачка, майстар дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва (шкло) — **70 г.**

**23** — **Фядотава Ірына Аляксандраўна** (1968, в. Садкі, Капыльскі раён), спартсменка (інваспорт, веласпорт), заслужаны майстар спорту Беларусі, двухкратная чэмпіёнка XI Паралімпійскіх гульняў (2000, Сіднэй), чэмпіёнка і сярэбраны прызёр XIII паралімпіёскіх гульняў (2008, Пекін), чэмпіёнка свету (2002, 2007), чэмпіёнка і сярэбраны прызёр чэмпіянатаў Еўропы (2001, 2003, 2005) — **55 г.**

**24** — **Тарашкевіч Серафіма Паўлаўна** (1913, в. Кавалевічы, Пухавіцкі раён — 2000), работнік сельскай гаспадаркі, Герой Сацыялістычнай Працы (1951) — **110 г.**

**25** — **Клім Рамуальд Іосіфавіч** (1933, в. Хвоева, Нясвіжскі раён — 2011), спартсмен і трэнер (лёгкая атлетыка), заслужаны дзеяч фізічнай культуры Беларусі, заслужаны майстар спорту СССР, заслужаны трэнер Беларусі, чэмпіён XVIII летніх Алімпійскіх гульняў (1964, Токіа), сярэбраны прызёр XIX летніх Алімпійскіх гульняў (1968, Мехіка) — **90 г.**

**25** — **Карызна Уладзімір Іванавіч** (1938, в. Закружка, Мінскі раён), паэт, адзін з аўтараў тэксту Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь, заслужаны дзеяч культуры Беларусі, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Беларусі, кавалер ордэна Францыска Скарыны — **85 г.**

**25** — **Булынка Міхаіл Грыгор'евіч** (1913, в. Талька, Пухавіцкі раён — ?), вучоны ў галіне фізікі, кандыдат тэхнічных навук (1950), дацэнт (1952) — **110 г.**

**28** — **Лагачоў Сяргей Сямёнавіч** (1958, г. Барысаў), мастак — **65 г.**

**31** — **Ходзін Сяргей Мікалаевіч** (1963, в. Путчына, Дзяржынскі раён), прафесар, доктар гістарычных навук — **60 г.**

**Чэрвень**

**3** — **Савіцкі Сцяпан** (1923, в. Вялікая Сліва, Слуцкі раён — 1996), вучоны ў галіне тэхналогіі шкла і сілікатаў, першы рэктар Віцебскага дзяржаўнага тэхналагічнага ўніверсітэта (1965—1988) — **100 г.**

**4** — **Рабцаў Міхаіл Яўсеевіч** (1923, г. Барысаў — 1989), ваенны дзеяч, удзельнік вызвалення Беларусі ў Вялікую Айчынную вайну, Герой Савецкага Саюза — **100 г.**

